**Литература**

1 Варламов, А. Б. Храм Христа Спасителя в Калининграде / А. Б. Варламов // Наше наследие. – 2002. – № 1. – С. 47–48.

2 Устименко, Н. Храмы Калининграда: история и современность / Н. Устименко // Краеведческий альманах Отечество. –2003. – №1. – С. 54 –58.

3 Власишев, Ю. П. Калининград. Оранжевый гид / Ю. П. Власишев. – Калининград : Эксмо-Пресс, 2012.– 200 с.

4 Пастернак, К. В. Мемельский иконостас – творение Дмитрия Ухтомского и московских иконописцев XVIII века / К. В. Пастернак // Вестник МГХПА. – 2015. – № 1. – С. 56–65.

5 Кулаков, В. И. Памятники истории и культуры Калининграда / В. И. Кулаков, А. П. Бахтин, Н. И. Чебуркин. – Москва : Лето-пресс, 2005. – 349 с.

**УДК 94:329.17(476)"1917"**

***У. У. Кручко***

## БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ГРАМАДА І НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У 1917 ГОДЗЕ

*Артыкул прысвечаны дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады ў беларускім нацыяеальным руху. У 1917 г. назіраецца актыўнасць дзейнасці беларускіх арганізацый, і выключэннем не стала БСГ. У артыкуле разгледжана дзейнасць Грамады ў беларускім нацыянальным руху ў пазначаны перыяд і ўплыў БСГ на развіццё нацыянальнага руху. Бо менавіта БСГ адыграла значную ролю ў адраджэнні беларускага нацыянальнага руху.*

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. знішчыла расійскае самадзяржаўе. Гэтая падзея адчыніла дзверы нацыянальным рухам народаў былой Расійскай імперыі. Не стаў выключэннем і беларускі нацыянальны рух. Аднавіла сваю дзейнасць Беларуская сацыялістычная грамада. Скасаванне расійскага самадзяржаўя стварыла ўмовы не толькі для ўсталявання дэмакратычнага ладу на тэрыторыі Расіі, але, як лічылі грамадаўцы і для нацыянальнага, і сацыяльнага вызвалення беларускага народу.

25–27 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся з’езд беларускіх арганізацый, які быў скліканы Мінскім аддзелам Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Гэты з’езд вітаў перамогу Лютаўскай рэвалюцыі і заявіў аб падтрымцы Часовага ўрада. Галоўнае праграмнае патрабаванне, якое было выпрацавана з’ездам, – гэта дзяржаўна-палітычная аўтаномія Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі [1, с. 470]. На з’ездзе разглядаліся пытанні, якія тычыліся этнаграфічных межаў Беларусі. У выніку этнаграфічная камісія прыйшла да высновы, што месца пераважнага пражывання беларусаў ахоплівала наступныя губерні: Мінская, Гродзенская, Магілёўская, частку Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў. Дзеля больш дакладнага вызначэння межаў было пастаноўлена стварыць асаблівую камісію з прафесараў М. К. Любаўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, Я. Ф. Карскага і А. А. Шахматава [2, с. 29–34]. Важны даклад зрабіў член БСГ Эдуард Будзька. Гэта быў даклад фінансавай камісіі. Дакладчык лічыў, што трэба стварыць нацыянальны грашовы фонд, і спачатку было пакладзена ў гэты фонд 2000 рублёў ад беларусаў Петраграда. Дакладчык прапанаваў захады для папаўнення нацыянальнага грашовага фонду. У прыватнасці, ён лічыў неабходным ставарыць аддзел для арганізацыі беларускага нацыянальнага банку і разасласць падпісныя лісты ўсім беларускім арганізацыям.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Таксама на гэтым з’ездзе быў створаны ў якасці выканаўчага органа Беларускі нацыянальны камітэт (БНК). БНК складаўся з 18 асоб: Р. Скірмунт, А. Смоліч, П. Аляксюк, Л. Заяц, Э удзька, В. Фальскі, Б. Тарашкевіч, В. Гадлеўскі, Е. Канчар, І Краскоўскі, А. Бурбіс, К. Кастравіцкі, Бабарыкін, Ф. Шантыр, М. Кахановіч, В. Іваноўскі, Л. Дубяйкоўскі, Д. Жылуновіч [2, с. 29–34].

БНК меў права кааптацыі, а таксама пакідаў магчымасць пашырацца прадстаўнікамі сялянскіх і беларускіх нацыянальных арганізацый. Большасць членаў БНК з’яўляліся прадстаўнікамі БСГ. Гэта вырашыла палітыку БНК.

8–10 ліпеня 1917 г. ў Мінску адбыўся з’езд беларускіх партыйных і грамадзянскіх арганізацый. Гэты з’езд быў склікааны з ініцыятывы Беларускага нацыянальнага камітэтэту, дзе старшынёй быў беларускі палітычны і грамадскі дзеяч Раман Скірмунт. Большасць членаў БНК складалі члены Грамады. Гэта мела моцны ўплыў на дзейнасць з’езду. Так, прадстаўнік з’езду нацыянальных арганізацый, член БСГ Э. Будзька дакладываў аб ходзе перагавораў з літоўцамі. Справа ў тым, што літоўцы патрабавалі ад Часовага ўраду, каб ім перадалі для кіраўніцтва Ковенскую, Віленскую і Сувалкаўскую губерні. БНК лічыў, што Віленская губерня не можа называцца чыста літоўскай. Таму петраградскія члены БНК звярнуліся да літоўскіх прадстаўнікоў, каб тыя больш дакладна вызначылі межы «сваёй сферы кіраўніцтва» і не захоплівалі мясцовасці пражывання беларусаў [3, с. 2–4].

На другі дзень працы з’езду партыйных і грамадзянскіх арганізацый, 9 ліпеня 1917 г., было прапанована склікаць Раду дэпутатаў беларускіх арганізацый. Аркадзь Смоліч, прадстаўнік БСГ, прапаноўваў перадаць палітычныя паўнамоцтвы БНК Выканаўчаму камітэту гэтага з’езда. Вінцэнт Гадлеўскі, які таксама з’яўлся членам БНК, быў супраць гэтай прапановы. А. Смольскага падтрымаў А. Цвікевіч. Каб зняць гэтае напружанне, было праведзена галасаванне. У выніку была прынятая рэзалюцыя В. Гадлеўскага, але з папраўкамі А. Смоліча. Потым яшчэ узнікла спрэчка паміж прадстаўнікамі БСГ і прадстаўнікамі Беларускай народнай партыяй сацыялістаў (БНПС) па пытаннях арганізацыі выбарчай сістэмы. Спрэчку выклікала пытанне: ці ў будучай Беларусі павінны быць мажарытарныя прапарцыянальныя выбары? БСГ была супраць мажарытарных выбараў. Грамадаўцы лічылі такія выбары недэмакратычнымі, як «насілуюшчых волю меншасці» [4, с. 2–4].

Важным этапам стварэння беларускай дзяржаўнасці з’яўлялася стварэнне Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый. 5–6 жніўня быў прыняты статут ЦРБА. Так, было вызначана, што адказным кіраўнікам і прадстаўнікам усіх беларускіх спраў ёсць Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый. Рада абвяшчала, што асноўным палітычным прынцыпам яе дзейнасці станецца «поўны дэмакратызм» [5, с. 91–92].

8–15 верасня 1917 г. у Кіеве адбыўся з’езд народаў, які быў скліканы Украінскай цэнтральнай радай. На з’езд прыехалі 90 чалавек – прадстаўнікі народаў, якія пражывалі на тэрыторыі былой Расійскай імперыі. На гэтым з’ездзе прысутнічаў і прадстаўнік Часовага ўраду Расіі. На гэтым з’ездзе было 8 беларусаў, з іх 2 былі члены БСГ.

На гэтым з’ездзе беларусы – прадстаўнікі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый – агучылі прамову, што захоп часткі тэрыторыі Беларусі немцамі пагражае небяспекай падзелу Беларусі, і даводзілі, што такі «гвалтоўны разбор» быў бы цяжкім парушэннем права беларусаў на самавызначэнне. Беларускія прадстаўнікі на гэтым з’ездзе прапанавалі, каб Часовы ўрад выдаў дэкрэт аб аўтаноміі Беларусі ў этнаграфічных межах у складзе Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі з канчатковым далучэннем да Беларусі захопленых немцамі тэрыторый беларусаў [6, с. 1–2].

Сур’ёзным набыткам нацыянальнага руху з’явілася далучэнне да яго беларусаў-вайскоўцаў. У такіх умовах беларускі нацыянальны рух у войску здолеў аформіцца арганізацыйна. 18–24 кастрычніка 1917 г. у Мінску адбыўся з’езд войнаў-беларусаў Заходняга фронту і Румынскага фронту. З’езд заклікаў гуртаваць сілы для барацьбы за тое, каб беларускі народ «змог заняць месца ў вялікай расійскай федэратыўнай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дэмакратычнай рэспублікі як роўны з роўнымі». Каб прадухіліць падзел беларускіх зямель суседнімі дзяржавамі і не дапусціць негатыўных наступстваў дэмабілізацыі расійскай арміі, дэлегаты з'езда прызналі неабходным утварэнне беларускага войска. Для кіраўніцтва была выбрана Цэнтральная беларуская вайсковая рада (ЦБВР), на чале якой стаяў член БСГ С. Рак-Міхайлоўскі [1, с. 483].

Перспектыва з'яўлення ўзброенай апоры нацыянальнага беларускага руху ўзмацніла настроі на арганізацыю ў Беларусі аўтаномнай сістэмы кіравання. Так, у Мінску 15–24 кастрычніка 1917 г. праходзіла II сесія Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый, паралельна праходзіў з'езд воінаў-беларусаў. У выніку сесіі Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый была пераўтворана ў Вялікую Беларускую раду (ВБР), выканаўчы камітэт ВБР узначаліў член БСГ В. Адамовіч [1, с. 483–484].

Для вызначэння дзяржаўнай і палітычнай будучыні Беларусі ў снежні 1917 г. быў скліканы Усебеларускі з'езд. На з'езд прыбылі 1872 дэлегаты, у тым ліку 1167 з правам вырашальнага голасу. Частка дэлегатаў падтрымлівала ВБР (старшыня В. Адамовіч – член БСГ), другая частка – Беларускі абласны камітэт, які месціўся ў Петраградзе. Дэлегацыя ВБР прапанавала абвясціць незалежную Беларускую рэспубліку [7, с. 92].

Прыхільнікі Вялікай беларускай рады дамагаліся абвяшчэння Беларускай рэспублікі і аддзялення дзяржавы ад Савецкай Расіі. Разумеючы, што для вырашэння задачы ўтварэння незалежнай беларускай дзяржавы патрэбна большасць галасоў, лідар «левай» фракцыі з'езда Т. Грыб заклікаў усе фракцыі да згоды, да ўтварэння адзінага непадзельнага сацыялістычнага беларускага фронту [7, с. 92].

15 снежня 1917 г. на з'ездзе Я. Варонка як прадстаўнік БСГ і сябар ВБР заявіў, што «гэты з'езд ёсць вынік цяжкай арганізацыйнай працы Беларускай сацыяльстычнай грамады яшчэ ў перыяд самадзяржаўя». У той час, як павядамляў Я. Варонка, расейскай дэмакратыяй быў пушчаны лозунг «самавызначэнне», але гэтая ж дэмакратыя трымае беларусаў пад гвалтам цэнтралістаў, сацыялістаў, абаронцаў. Я. Варонка потым заявіў: «Яшчэ 17 жніўня ў Маскве прадстаўнікі сацыялістычнай грамады заявілі аб самавызначэнні. Гэты кліч беларускіх рэвалюцыянераў застаўся «гласом вопиющего в пустыне». Калі ўкраінцы заявілі аб самавызначэнні – Керанскі заявіў пратэст». Акрамя гэтага, аратар абвясціў на з'ездзе рэзалюцыю ЦРБА, якая была апублікаваная на Усерасійскай дэмакратычнай нарадзе 17 верасня 1917 г. У гэтую рэзалюцыю ўваходзілі пункты, якія тычыліся будучага дзяржаўнага і сацыяльнага ўладкавання Беларусі. Але, як заявіў Я. Варонка: «Гэты кліч застаўся клічам» [8, с. 61–69].

У сваім дакладзе Я. Варонка казаў: «Уся Расія арганізуецца ў самастойныя адзінкі: Украіна, Сібір, Эстонія, Фінляндыя, зараз Татарская рэспубліка. Толькі адна Беларусь чакае чагосьці. Калі ж мы абвясцім Рэспубліку?».

Далей дакладчык заявіў: «Задача з'езда – арганізаваць краёвую ўладу; выказаць сваё стаўленне да міру к зямле і да акупацыі Беларусі. Павіна быць абвешчана Беларуская рэспубліка ў федэрацыі з астатнімі рэспублікамі Расіі. Павінна быць арганізавана Краёвая рада (Савет рабочіх, солдацкіх і сялянскіх дэпутатаў). Яе задачы: склікаць Беларускі ўстаноўчы сход, адносіны да міру і пасылка дэлегатаў на мірную канферэнцыю… Петраградскі ўрад Народных камісараў – урад Усерасійскі. Ён апублікаваў дыкрэт аб самавызначэнні. Прызнанне ўлады павінна быць, бо яна не супярэчыць беларускаму самавызначэнню. Не было цалкам у Вялікай Рады стродкаў, і яна вядома, не магла весці шырокую прапаганду. Перад намі ляжаць вялікія задачы, што Вы гаспадары края і што ніхто не можа распараджацца Вамі, каб Гродзенская і Віленская губерні не былі аддзеленыя. Зараз або ніколі! Ваша слова, каб Вы казалі сказалі важкае слова. Вы павінны ўзяць у свае рукі ўладу. Глядзіце, каб гэтыя лозунгі на загінулі. Беларусь павінна вырашыць лёс Расійскай федэрацыі» [8, с. 61–69].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

17(31) снежня ўвечары пачалося пленарнае пасяджэнне з'езда. На парадку дня было пытанне аб краёвай уладзе. Канчатковы тэкст рэзалюцыі рыхтавала Рада з'езда [9, с. 62–69]. У выніку спрэчак паміж прыхільнікамі ВБР і БАК была прынятая рэзалюцыя, аб стварэнні органа краёвай улады ў асобе Усебеларускага савета сялянскіх, салдацкіх і працоўных дэпутатаў. Савет павінен быў стаць галоўным органам кіравання беларускім краем, уступаючы ў адносіны з цэнтральнай уладай. У аснову сваёй працы Савет павінен быў паставіць тыя рашэнні, якія былі разгледжны на Усебеларускім з'ездзе. Для вырашэння шэрагу пытанняў кіравання Беларуссю Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў павінен быў склікаць другі Усебеларускі з'езд [10, с. 106–108; 11, с. 50–62].

З'езд не паспеў абраць Усебеларускі савет. 17(31) снежня 1917 г. Бальшавіцкі Савет народных камісараў Заходняй вобласці і фронту прыняў рашэнне распусціць першы Усебеларускі з'езд і прапанаваў яго прызідыуму пакінуць межы вобласці і фронту. На паседжанне з'езду прыйшлі нарком унутраных спраў Рэзаўскі, начальнік мінскага гарнізона Крывашэін і абвясцілі аб роспуску з'езда, а прызідыум арыштаваным. У залу ўварваліся салдаты бальшавіцкага Першага мінскага рэвалюцыйнага атрада пад камандаваннем Рамнёва. Дэлегаты супраціўляліся, але дарэмна. З'езд быў разагнаны. Раніцай 18 снежня 1917 г. савет з'езда пастанавіў лічыць першы Усебеларускі з'езд гвалтоўна разагнаным [7, с. 93].

Такім чынам, БСГ у 1917 г. мела моцны і нават вызначальны ўплыў на развіццё беларускага нацыянальнага руху, яе прадстаўнікі прыймалі ўдзел ва ўсіх лёсавызначальных падзеях фармавання дзяржаўнай і палітычнай будучыні Беларусі.

## Літаратура


1 Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 518 с.

2 Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 сакавіка 1917 г. // Спадчына. – 1990. – № 4 – С. 29–34.

3 З'езд дэлегатаў ад беларускіх партыйных і грамадзянскіх арганізацый 8–10 ліпеня ў Мінску // Вольная Беларусь. – 1917. – № 8. – С. 2–4.

4 З'езд дэлегатаў ад беларускіх партыйных і грамадзянскіх арганізацый 8–10 ліпеня ў Мінску // Вольная Беларусь. – 1917. – № 12. – С. 2–4.

5 Статут Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый // Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Ф. Турук. – Москва : Гос. изд-во, 1921. – С. 91–92.

6 З'езд народаў // Вольная Беларусь. – 1917. – № 23. – С. 1–2.

7 Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.

8 Скалабан, В. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка / В. Скалабан // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 3. – С. 61–69.

9 Скалабан, В. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка / В. Скалабан // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 62–69.

10 Постановление 1-го Всебелорусского съезда о самоопределении Белоруссии и о временной краевой власти // Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Ф. Турук. – Москва : Гос. изд-во, 1921. – С. 106–108.

11 Скалабан, В. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка (заканчэнне) / В. Скалабан // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 4. – С. 50–62.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ